ла», фантастычных і футурыстычных пейзажаў М. Чурлёніса, К. Юона, чым да каго-небудзь з суайчыннікаў [1, с. 66].

Такім чынам, Я. Н. Драздовіч быў пачынальнікам і на працягу доўгага часу адзіным распрацоўнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве.

Тэма космасу і касмічнага была ўласціва мастацтву канца XIX – пачатку XX стагоддзя, але аналагаў творчасці Язэпа Драздовіча ў сусветнай практыцы не існуе. Шмат мастакоў развівалі касмічныя тэорыі ў мастацтве, але толькі Драздовіч змог рэалістычна і дэталёва апісаць сваё касмагарычные светаўспрыманне.

Унікальнасць духоўнай спадчыны Язэпа Драздовіча заключаецца яшчэ ў тым, што яна добра захаваная ў музеях і бібліятэках Беларусі і замежжа, у прыватных калекцыях. Аднак значная частка творчай спадчыны Я. Драздовіча (магчыма, большая) згублена ці загінула бясследна.


1. *Казлоўскі, М.* Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак : успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы / уклад. Міхася Казлоўскага. – Мінск : Маст. літаратура, 2014. – 544 с.

2. *Усава, Н. М.* Славутыя мастакі з Беларусі. Язэп Драздовіч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 43 с.

3. *Цыбульскі, М.* Язэп Драздовіч: «Прыйдзе час…» : зб. матэр., прысвеч. 120-годдзю з дня нараджэння мастака / пад рэд. М. Цыбульскага. – Смаленск, 2008. – 154 с.


## КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗІЦЯЧЫХ І ШКОЛЬНЫХ БІБЛІЯТЭК У ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ


***Н. А. Ляйко,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*
***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


У Беларусі 2018–2020 гг. пройдуць пад знакам Года малой радзімы. Гэта будзе садзейнічаць сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёнаў, фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі насельніцтва краіны, захаванню і папулярызацыі здабыткаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны. Год малой радзімы характарызуецца ўздымам і развіццём краязнаўства, у тым ліку бібліятэчна-бібліяграфічнага.

Краязнаўства – адзін з важнейшых кірункаў дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк у разглядаемы перыяд. Асноўная мэта краязнаўчай дзейнасці – выхаванне ў дзяцей і падлеткаў любові да малой радзімы, зямлі, знакамітых землякоў, пісьменнікаў і паэтаў, вучыць ганарыцца тым, што мы беларусы, адчуваць гордасць за сваю малую радзіму.

Пры арганізацыі краязнаўчай дзейнасці дзіцячыя бібліятэкі падтрымліваюць сувязі са школамі, музеямі, грамадскімі арганізацыямі, мясцовым друкам і інш. У першую чаргу значная ўвага надаецца фарміраванню фонда краязнаўчых дакументаў і ўдасканаленню краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата. Кожная бібліятэка збірае матэрыялы пра мясцовыя звычаі, традыцыі, фальклор; краязнаўчыя дапаможнікі, літаратурнае і гістарычнае краязнаўства; творчасць пісьменнікаў і артыстаў – землякоў і іншых знакамітых людзей, герояў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны; летапіс вёсак і гарадоў, этнаграфічныя і геалагічныя матэрыялы і інш. Шырокім попытам у дзяцей і падлеткаў на сучасным этапе карыстаюцца краязнаўчыя базы даных (БД), прысвечаныя гісторыка-культурным помнікам, знакамітым землякам.

Краязнаўчая дзейнасць у Год малой радзімы з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у рабоце дзіцячых і школьных бібліятэк. Галоўная ўвага надаецца папаўненню існуючых і стварэнню новых электронных краязнаўчых рэсурсаў.

Добрай тэндэнцыяй у рабоце дзіцячых бібліятэк становіцца правядзенне краязнаўчых канферэнцый, арганізацыя выставак, літаратурна-мастацкіх свят, ушанаванне знакамітых ураджэнцаў, прэзентацыі, літаратурна-музычныя гасцёўні, сустрэчы з мясцовымі краязнаўцамі, людзьмі, адданымі свайму краю.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў арганізацыі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска. У прыватнасці, такім было абмеркаванне твораў класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і Я. Коласа, прысвечанае Году малой радзімы пад назвай «Абавязак маёй зямлі – мой абавязак». У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні 25-й і 101-й мінскіх школ, якія пазнаёміліся з серыяй кніг «Славутыя імёны». У іх прадстаўлены змястоўны і ілюстратыўны матэрыял пра славутых землякоў. Творчасць гэтых знакамітых людзей дапамагае юным чытачам праз літа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ратуру зразумець жыццёвыя каштоўнасці, любіць свой край, сваю мову, садзейнічаць фарміраванню любові да сваёй радзімы, роднай зямлі.

Узаемасувязь са школамі ў выхаванні дзяцей і падлеткаў адчувалася ў кожным выступленні ў час міжнароднага семінара «Детское чтение: проблемы, поиски, решения», які быў праведзены на базе Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя А. С. Астроўскага г. Мінска. Найбольш мэтанакіраваным было выступленне настаўніцы беларускай мовы і літаратуры СШ № 203 г. Мінска, якая ў дакладзе «Фарміраванне цікавасці да чытання» падкрэсліла не толькі агульныя праблемы, якія стаяць перад школай і бібліятэкай на сучасным этапе па далучэнні дзяцей і падлеткаў да кнігі, але асаблівую ўвагу звярнула на неабходнасць чытання беларускай літаратуры на роднай мове, пацвердзіла неабходнасць цеснага супрацоўніцтва паміж школай і дзіцячай бібліятэкай па пытаннях фарміравання цікавасці да чытання ў дзяцей і падлеткаў, больш шырокага выкарыстання інавацыйных праграм і праектаў дзіцячых бібліятэк па далучэнні дзяцей і падлеткаў да чытання, у тым ліку беларускай і краязнаўчай кнігі [1, с. 20].

«Мая малая радзіма – Мінск, а хлеб усяму галава» – такая назва яскрава сведчыць аб прызначэнні мерапрыемства. Дзіцячая бібліятэка № 12 г. Мінска такім чынам знаёміла выхаванцаў дзіцячага садка № 288 з паняццямі «вялікая радзіма» і «малая радзіма». Мерапрыемства дапамагло дзецям зразумець, што «вялікая радзіма – гэта Рэспубліка Беларусь, а «малая радзіма» – гэта месца, дзе мы нарадзіліся, зрабілі першыя крокі, дзе жывуць мама і тата, дзядуля і бабуля, а таксама нашы сябры. З задавальненнем дзеці слухалі казкі, легенды, паданні, самі чыталі вершы, прыгадвалі прымаўкі. Дзеці не толькі адпачылі, атрымалі задавальненне ад мерапрыемства, але і набылі новыя веды, даведаліся, чаму трэба шанаваць і берагчы хлеб і сваю радзіму.

У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы ім. М. А. Астроўскага г. Мінска сфарміраваны БД уласнай генерацыі, якія маюць непасрэднае дачыненне да краязнаўчай тэматыкі і шырока выкарыстоўваюцца ў філіялах дадзенай ЦБС і ў іншых бібліятэках, якія абслугоўваюць дзяцей і падлеткаў. Сярод асноўных тэм: «Возвращение к истокам: путешествие по столицам белорусской письменности», «Память, бронза и герои книг: Память, памятник, песня: о песнях, ставших памятниками», «1812: Беларусь, события, люди», «Вершы пра Мінск» і інш. Напрыклад,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у дзіцячай бібліятэцы № 15 г. Мінска праведзены конкурс чытальнікаў «Мой родны Мінск, ты сэрца Беларусі», у якім прынялі ўдзел навучэнцы 3 «В» класа СШ № 207. Яны з гонарам чыталі вершы аб родным горадзе і з цікавасцю слухалі легенды аб узнікненні і развіцці горада, многія дзяліліся сваімі ведамі аб гісторыі г. Мінска, яго помніках, тэатрах і музеях. У сувязі з тым, што 2018 г. у Беларусі праходзіць пад знакам малой радзімы, у час якога разглядаюцца розныя тэмы, у тым ліку і аб захаванні парадку і прыгажосці роднай краіны, ахове навакольнага асяроддзя, супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі прынялі актыўны ўдзел у экалагічным выхаванні сваіх чытачоў. У прыватнасці, яны стварылі лістоўку – зварот: «РазДельный сбор отходов!».

У Год малой радзімы супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі № 1 г. Мінска ажыццяўлялі сумесную дзейнасць са школамі і музеямі. Яны правялі сумесна з музеем Міністэрства ўнутраных спраў цікавую сустрэчу вучняў 42-й гімназіі г. Мінска з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Ф. М. Супрановічам. У сваім выступленні ён гаварыў аб сваім удзеле ў баях, выкананні складаных заданняў і тых цяжкасцях, якія прыйшлося пераадолець. Вельмі важна, што яны верылі ў перамогу. Галоўнае – гэта бязмерная любоў да Радзімы, таму галоўная мэта – Перамога. Такія мерапрыемствы садзейнічаюць патрыятычнаму выхаванню дзяцей і падлеткаў, любові і адданасці малой радзіме.

Трэба адзначыць, што дзіцячыя бібліятэкі нашай краіны вядуць пастаянную выхаваўчую работу з дзецьмі, у тым ліку і ў час летняга адпачынку. Так, супрацоўнікі дзіцячага аддзела г. Барысава ў Год малай радзімы арганізоўваюць адпачынак у розных кірунках дзейнасці для вучняў, якія летам знаходзяцца ў прышкольных лагерах. Дзеці з задавальненнем наведваюць гэтыя мерапрыемствы. Асаблівую цікавасць у вучняў СШ № 8 г. Барысава вызвала электронная выстава «Барысаў – горад-загадка мінулых вякоў», у час якой яны пазнаёміліся з сімволікай горада, яго гісторыяй, заснаваннем, помнікам знакамітым землякам. Дзеці адкрылі шмат новых невядомых старонак аб родным горадзе. Нікога не пакінула раўнадушным экскурсія для вучняў СШ № 2 г. Барысава «Сядзіба, або хатка з матчынай душой», у час якой дзеці азнаёміліся з сямейным укладам, бытам і абрадамі нашых далёкіх продкаў. Яны даведаліся аб промыслах і рамёствах беларусаў, як будавалася традыцыйнае жыллё, аб прыметах пры выбары месца будаўніцтва хаты. Цікава было пазнаёміцца як выпякалі хлеб, выхоўвалі дзяцей,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што азначаюць паняцці «Красны кут», «Купалле», «Масленіца», «Дзяды».

Адным з найбольш яскравых прыкладаў садзейнічання арганізацыі краязнаўчай дзейнасці сярод дзяцей і падлеткаў з'яўляецца часопіс «Бібліятэка прапануе». Ён з'яўляецца сапраўдным інфармацыйным падмуркам краязнаўчай дзейнасці для супрацоўнікаў дзіцячых і школьных бібліятэк. Значная ўвага надаецца методыцы арганізацыі і правядзення краязнаўчай дзейнасці. Аб гэтым сведчаць асноўныя рубрыкі часопіса: «Да Году малой радзімы», «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Аб чым не паведаміў падручнік», «Праекты ў бібліятэцы», «Давай ганарыцца, што мы беларусы», «Інфармацыйнае забеспячэнне адукацыі». Любоў да малой радзімы выхоўваюцуь па-рознаму: праз любоў да сваёй зямлі, знакамітых людзей, паэтаў і пісьменнікаў, мастацтва, вучоных, герояў Вялікай Айчыннай вайны, адданых справе землякоў і г. д. Аб гэтым неаднаразова распавядаў часопіс «Бібліятэка прапануе», у якім ёсць надзвычай цікавыя і неабходныя матэрыялы, прысвечаныя Году роднай зямлі. Сярод іх, у прыватнасці, наступныя: Г. Свістун «Краявіды роднага краю, вам у любові я прысягаю: краязнаўчы палілог», І. Касцючкова «Заповедный мотив – Беловежская пуща: актуальное путешествие к 600-летию заповедника», А. Чуеўская «Пявучыя струны душы: сцэнарый літаратурна-музычнай вечарыны, прысвечанай творчасці А. Ставера» і інш. У супрацоўнікаў бібліятэк і школьнікаў вялікім попытам карыстаюцца дадаткі да часопіса, напрыклад, «История в лицах и событиях» [2].

На наш погляд, застаўляе задумацца мерапрыемства, праведзенае ў сярэдняй школе № 3 г. Пінска, пад назвай «Таямнічыя ключы памяці», прысвечанае фарміраванню самасвядомасці, любові да Радзімы і яе гісторыі, далучэнню да нацыянальнай культуры. Асноўны лейтматыў мерапрыемства – «Давай ганарыцца, што мы беларусы». Адзін з выступаючых падкрэслівае: «Не адпачывалі нашы продкі не толькі на Гаваях ці Канарах, наогул не адпачывалі. І не праклінал радзіму, не насміхаліся над зямлёй бацькоў, не кпілі з іх за тое, што яны не накралі за сваё жыццё. А зараз… Іншы раз ад годнасці нашай мала застаецца… Становіцца сумна. Бацькі і дзяды нашы выстаялі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, збераглі нашу краіну» [1, с. 14]. Мы таксама павінны шанаваць яе, ганарыцца нашым мінулым, берагчы родную мову. Таму гэтай тэмай заклапочаны супрацоўнікі дзіцячых і школьных бібліятэк.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асаблівую цікавасць уяўляюць для нас «Каляндары знамянальных і памятных дат…», якія даюць магчымасць азнаёміцца з важнейшымі падзеямі і знамянальнымі датамі на пэўны год. Так, у трэцім нумары часопіса «Бібліятэка прапануе» за 2018 г. змешчаны Каляндар, у якім прыводзяцца наступныя звесткі: «У 2019 годзе спаўняецца» 520 гадоў з часу атрымання Мінскам Магдэбургскага права (1499); 390 гадоў з дня нараджэння Сімяона Полацкага (1629–1680), беларускага пісьменніка, філосафа, асветніка, педагога, тэолага, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча; 95 гадоў з часу заснавання Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі г. Мінска (1924); 100 гадоў з часу заснавання Віленскай беларускай гімназіі (1919–1944), адной з першых беларускіх сярэдніх навучальных устаноў Заходняй Беларусі; 145 гадоў з часу здачы ў эксплуатацыю Мінскага вадаправода (1874); 95 гадоў з пачатку выдання «Летапісу друку Беларусі» (1924), штомесячнага дзяржаўнага бібліяграфічнага паказальніка і інш. [3, с. 2].

Больш дакладная інфармацыя знамянальных і памятных дат прадстаўляецца кожны квартал. У прыватнасці, у «Каляндары знамянальных і памятных дат на I квартал 2019 года» указваюцца падрабязна галоўныя падзеі на кожны месяц. Напрыклад, 1 студзеня спаўняецца 90 гадоў з дня адкрыцця Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі Беларусі (г. Мінск, 1929 г.); 17 студзеня спаўняецца 55 гадоў з дня нараджэння Андрэя Федарэнкі (1964), беларускага пісьменніка, лаўрэата літаратурных прэмій [3, с. 27, 29].

У часопісе друкуюцца не толькі матэрыялы розных метадычных распрацовак і сцэнарыяў, прысвечаных краязнаўчай дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк, падрыхтаваных спецыялістамі ў галіне бібліятэчнай справы, але і метадычныя матэрыялы мерапрыемстваў, якія падрыхтаваны і праводзяцца настаўнікамі і класнымі кіраўнікамі школ з усіх абласцей Беларусі.

Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк у Год малой радзімы значна актывізавалася, што садзейнічае адраджэнню гістарычнай памяці, экалагічнай культуры, фарміраванню самасвядомасці і далучэнню да нацыянальнай культуры, любові да сваёй малой радзімы, патрыятычнаму выхаванню дзяцей і падлеткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Березовская, Е.* Международный семинар «Детское чтение: проблемы, поиски, решения» / Е. Березовская // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 19–20.

2. История в лицах и событиях / ред.-сост. О. А. Томашова. – Минск : Красико-Принт, 2014. – 128 с. – (Библиотека предлагает).

3. Каляндар знамянальных і памятных дат: У 2019 годзе спаўняецца // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 24–26.

4. *Паплаўко, В.* Таямнічыя ключы памяці: пазакласнае мерапрыемства для вучняў 6 кл. / В. Паплаўко // Бібліятэка прапануе. – 2018. – № 1. – С. 12–15.

# МУЗЕЙ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ ЛЮБОВІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬГАГА ЎЗРОСТУ

***В. І. Мазалеўскі,***
*старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сённяшні дзень праблема патрыятычнага выхавання дзяцей старэйшага школьнага ўзросту з'яўляецца адной з найбольш важных і актуальных у сучасным грамадстве.

Праблема мадэрнізацыі патрыятычнага выхавання ў сістэме адукацыі звязаны з выяўленнем і захаваннем назапашаных лепшых традыцый у выхаванні падрастаючага пакалення, абнаўленнем яго зместу, праектаваннем новых тэхналогій.

Асноўнай мэтай патрыятычнага выхавання з'яўляецца арыентацыя падрастаючага пакалення на каштоўнасці беларускай культуры, фарміраванне ў яго беражлівых адносін да Радзімы, яе культурна-гістарычнага мінулага. Патрыятызм як шматграннае па сваім змесце паняцце ўключае ў сябе:

– любоў да родных мясцін, павага мінулага сваёй Радзімы, гонар за свой народ;

– павагу да іншых народаў, іх звычаяў і культуры, адсутнасць расавай і нацыянальнай варожасці;

– адчуванне непарыўнасці з навакольным светам, жаданне захаваць, прымножыць багацці сваёй краіны, гатоўнасць быць грамадзянінам, абараняць Айчыну і служыць яе інтарэсам.

Існуе шмат азначэнняў паняцця грамадзянін, якія раскрываюць розныя яго аспекты. Найбольш дакладным з'яўляецца наступнае: «Грамадзянін – асоба, якая належыць да пастаяннага